Весці БДПУ. Серыя 1. 2018. № 2. С. 95–98.

УДК 811.161.3

# ПЫТАННЕ ПРА ПАРЦЭЛЯЦЫЮ Ў ГІСТОРЫІ МОВАЗНАЎСТВА

**К. І. Субота,**
*аспірант кафедры мовазнаўства і лінгвадыдактыкі БДПУ*

UDC 811.161.3

# THE ISSUE ABOUT PARCELING IN HISTORY OF LINGUISTICS

**K. Subota,**
*Post-Graduate Student of the Department of Belarusian Linguistics and Linguodidactics, BSPU*

Паступіў у рэдакцыю 12.04.18.

Received on 12.04.18.

У артыкуле разглядаюцца семантыка-сінтаксічныя асаблівасці парцэляваных канструкцый, гісторыя іх вывучэння. Прааналізаваны і сістэматызаваны працы Л. У. Шчэрбы, А. Ф. Яфрэмава, В. У. Вінаградава, Ю. В. Ваннікава, Я. А. Іванчыкавай, А. П. Скавароднікава, К. У. Харытонавай, Е. А. Пакроўскай і іншых, выяўлены і апісаны іх метадалагічныя прынцыпы даследавання.
У артыкуле апісваецца сінтаксічная арганізацыя парцэляваных канструкцый, розныя падыходы да іх вывучэння, размяжоўваюцца паняцці «сегментацыя», «парцэляцыя» і «далучэнне» на аснове камунікатыўнага, структурна-семантычнага і кагнітыўна-псіхалагічнага падыходаў.

*Ключавыя словы:* парцэляцыя, далучэнне, сегментацыя, сепаратызацыя, адасабленне, актуалізаваны сінтаксіс, дынамічны сінтаксіс.

The article is dedicated to one of the urgent problems of present syntax, that is to the problem of parceled constructions and the history of its studying.
The studies of L. Shcherba, A. Efremov, V. Vinogradov, Y. Vannikov, E. Ivanchikova, A. Skovorodnikov, E. Kharitonova, E. Pokrovskaya and others are analyzed and systematized, methodologic principles of their research are revealed and described.
The article describes syntactic organization of parceled constructions, different approaches to its studying. Segmentation, parceling and attaching are differentiated using structural-semantic, communicative and cognitive-psychological approaches.

*Keywords:* parceling, attaching, segmentation, actualized syntax, dynamic syntax.

У сінтаксічнай сістэме беларускай мовы на працягу ХХ ст. адбываюцца адметныя змены, назіраюцца пэўныя тэндэнцыі, працэсы, якія не маюць раўнамернага, паступовага развіцця. Як адзначаюць даследчыкі (М. С. Валгіна, Г. Н. Акімава, К. У. Харытонава і інш.), распаўсюджанасць расчлененых і сегментаваных сінтаксічных канструкцый – адна з асаблівасцей сучаснага сінтаксісу [1–3]. Узнікненне гэтай з'явы абумоўлена ўплывам вуснага маўлення на пісьмовую мову. Сінтаксіс з сістэмай устойлівых сувязей і адносін, з пастаяннымі межамі сказаў у апошні час саступае месца сінтаксісу актуалізаванаму.

У сучаснай літаратурнай мове, асабліва ў мастацкім стылі маўлення, шырока распаўсюджана такая з'ява дынамічнага сінтаксісу, як ***парцэляцыя.*** Яна прадстаўляе сабой праяўленне асіметрыі ў сінтаксісе, пры гэтым сказ дзеліцца на часткі, і залежная частка фарміруецца ў асобны сказ. Парцэляцыя ўласціва не толькі беларускай, а і англійскай, французскай, іспанскай, нямецкай, рускай і іншым мовам. Недастатковая вывучанасць сутнасці дадзенай стылістычнай фігуры, яе структурна-семантычных і функцыянальных характарыстык у беларускай мове выклікае шэраг нявырашаных тэарэтычных і практычных пытанняў.

Задоўга да з'яўлення тэрміна *парцэляцыя* гэтая з'ява неаднаразова вывучалася навукоўцамі і называлася ***далучэннем.*** Як аб'ект спецыяльнага даследавання далучэнне вызначылася ў пачатку ХХ ст. Увядзенне ў навуковым ужытку тэрмінаў ***далучэння*** і ***далучальнай сувязі*** звязваецца з імем акадэміка Л. У. Шчэрбы, які звярнуў увагу на тое, што некаторыя злучнікі выкарыстоўваюцца ў функцыі далучальных [4, с. 23].

У сучасным значэнні тэрмін *парцэляцыя* быў упершыню выкарыстаны А. Ф. Яфрэмавым у працы «Мова Н. Г. Чарнышэўскага» [5, с. 18]. Стракатасць і супярэчлівасць канцэпцый сведчыць пра складаны характар названай з'явы, гэта пацвярджаецца тым фактам, што ў навуковай літаратуры значэнне тэрміна *парцэляцыя* не адназначнае. Парцэ-

ляцыю кваліфікуюць як *моцнае адасабленне, далучэнне, сепаратызацыю, сегментацыю.* У апошні час сфарміравалася ўстойлівая тэндэнцыя атаясамліваць парцэляцыю з далучэннем.

У артыкуле «Да пытання аб дыферэнцыяцыі з'яў парцэляцыі і дынамічнага далучэння» А. А. Вінаградаў для вырашэння гэтай праблемы ўводзіць паняцце ***дынамічнага далучэння,*** якое, на яго думку, дазваляе, з аднаго боку, адмежаваць факты моўнага (статычнага) далучэння як семантыка-сінтаксічнай катэгорыі ад вусна-маўленчага далучэння, а з другога – усвядоміць неабходнасць размежавання з'яў парцэляцыі і дынамічнага далучэння, якія маюць агульную фармальную прыкмету – *сегментаванне* [6, с. 99].

В. У. Вінаградаў вылучыў экспрэсіўна-семантычную прыкмету далучальных канструкцый, часткі якіх лагічна не аб'ядноўваюцца ў цэлае (хоць і складанае) ўяўленне, а ўтвараюць асацыятыўны ланцужок далучэння [7, с. 567–581]. У сярэдзіне 60-х гг. ХХ ст. з'явілася адразу некалькі фундаментальных даследаванняў па пытаннях актуалізацыі мовы і парцэляваных канструкцый. Першым сур'ёзным даследаваннем праблемы парцэляцыі стала праца Ю. В. Ваннікава, у якой аўтар даў апісанне парцэляваных канструкцый, даследаваў іх структурныя тыпы, логіка-семантычныя і экспрэсіўныя асаблівасці. Ю. В. Ваннікаў кваліфікуе парцэляцыю як спосаб маўленчага падзелу адзінай сінтаксічнай структуры, г. зн. сказа, пры якім дадзеная структура функцыянуе ў некалькіх інтанацыйна-сэнсавых моўных адзінках [8, с. 201].

Я. А. Іванчыкава адносіць парцэляцыю да прыему экспрэсіўнага сінтаксісу пісьмовай літаратурнай мовы, сутнасць якога заключаецца ў падзеле сінтаксічна звязанага тэксту на інтанацыйна абумоўленыя адрэзкі, якія аддзелены знакам кропкі. Даследчык адзначае, што ў аснове парцэляцыі ляжыць перайманне жывой гаворкі, калі мова не з'яўляецца абдуманай і фармулюецца ў час фарміравання думкі [9, с. 101].

А. П. Скавароднікаў удакладняе змест паняццяў *парцэляцыя* і *далучэнне*, сцвярджаючы, што далучэнне варта лічыць з'явай статычнага аспекту сказа, а парцэляцыю – дынамічнага аспекту, якое можа сустракацца ў простых і складаных сказах розных структур, у тым ліку і ў сказах з далучальнымі адносінамі [10, с. 140–143]. Далей навуковец аналізуе класіфікацыі парцэляваных канструкцый, распрацаваныя Ю. В. Ваннікавым, Я. А. Іванчыкавай. У выніку даследчык прапануе сваю тыпалогію і вылучае тры разнавіднасці дадзеных канструкцый – з парцэляцыяй моцнай, сярэдняй і слабай. А. П. Скавароднікаў адзначае, што дадзеная класіфікацыя грунтуецца на структурна-стылістычнай характарыстыцы парцэляцыі і «ахоплівае ўвесь корпус парцэляваных канструкцый у выглядзе адзінага градацыйнага ланцужка, члены якога супастаўляюцца па ступені экспрэсіўнасці» [10, с. 144].

У апошнія дзесяцігоддзі з'явілася вялікая колькасць прац, прысвечаных вывучэнню парцэляцыі на матэрыяле розных моў: рускай, украінскай, англійскай, французскай, нямецкай, беларускай і інш., што сведчыць пра ўніверсальнасць дадзенай з'явы. Так, у працы «З'ява парцэляцыі ў мове сучасных сродкаў масавай камунікацыі» Л. І. Конюхова даследуе асаблівасці парцэляваных канструкцый у мове ўкраінскіх сродкаў масавай інфармацыі. На аснове структурна-семантычнага прынцыпу разглядаецца падзел простага і складанага сказа, у тым ліку бяззлучнікавага складанага, дзе парцэляцыя праяўляецца неадназначна; апісваецца парцэляцыя інтэнсіянальных і экстэнсіянальных элементаў структуры выказвання [11, с. 13].

А. А. Андрыеўская ў даследаванні, праведзеным на матэрыяле сучаснай французскай мастацкай прозы, выкарыстоўвае тэрмін *сепаратызацыя* ў адносінах да паняцця расчлененага сказа. На думку даследчыцы, сепаратызацыяй можна лічыць з'яву *крайняга адасаблення*, дзе адасоблены член сказа (слова ці словазлучэнне) інтанацыйна і графічна аддзяляецца не коскай, а кропкай, і такім чынам адасабленне выходзіць за нарматыўную мяжу сказа і ўтварае самастойную сінтагму [12, с. 66]. А. А. Андрыеўская прапаноўвае класіфікаваць подобныя з'явы на аснове суаднесенасці адасобленай сінтагмы з будовай зыходнага сказа. Гэта класіфікацыя будуецца на традыцыйным структурна-семантычным падыходзе.

Л. У. Шчэрба першым сфармуляваў псіхалагічную прыкмету далучальных канструкцый – *ненаўмыснасці*. Далучальная сувязь вызначалася ім як такая, пры якой «другі элемент з'яўляецца ў свядомасці толькі пасля першага выказвання або падчас яго» [4, с. 24]. У канцы ХХ – першым дзесяцігоддзі ХХІ ст. узмацненне ў мовазнаўстве цікавасці антрапацэнтрычнага характару да

дыскурсіўнага аспекту арганізацыі тэксту, камунікатыўна-прагматычных установак адрасанта мовы паспрыяла даследаванню з'явы парцэляцыі з улікам кагнітыўна-псіхалагічных асаблівасцей функцыянавання мовы. Я. М. Пінегіна адзначае неабходнасць выйсці за межы апісання сінтаксічнай структуры і ўлічваць пэўныя экстралінгвістычныя ўмовы, якія вызначаюць сутнасць парцэляваных канструкцый. Аналіз структуры, семантыкі, функцый парцэляваных канструкцый немагчымы без устанаўлення іх сінтагматычных і парадыгматычных сувязей у структуры тэксту, а таксама экстралінгвістычных фактараў структурнай і камунікатыўнай арганізацыі тэксту: прагматычнага, сацыякультурнага, псіхалагічнага [13, с. 22]. Н. К. Філонава характарызуе парцэляцыю як з'яву актуальнага падзелу, абумоўленага камунікатыўнай інтэнцыяй адрасанта [14, с. 33].

К. У. Харытонава адзначае, што праблема падзелу выказвання цесна звязана з праблемай псіхалагічнага стану адрасанта, гэта апраўдвае экспансію лінгвістыкі ў галіну кагнітыўнай псіхалогіі і філасофіі мовы. Таму ў расчлененых сказах увага акцэнтуецца на інтанацыі і адасабленні [3, с. 38].

Тэарэтычныя палажэнні прац Н. Д. Аруцюнавай, Г. М. Акімавай заснаваны на разуменні парцэляцыі як з'явы камунікатыўна-функцыянальнага плана сказа, яго дынамічнага аспекту. Аўтары сучасных работ па сінтаксісе адзначаюць павелічэнне расчлененых канструкцый у лінгвакультуралагічнай парадыгме мовы. Напрыклад, А. А. Пакроўская ў працы «Дынаміка рускага сінтаксісу ў XX стагоддзі: лінгвакультуралагічны аналіз» звяртае ўвагу на стадыяльны характар уваходжання сінтаксічных канструкцый у рускую літаратурную мову [15, с. 38]. Вучоны адзначае, што першапачаткова парцэляваныя канструкцыі ўжываліся толькі ў індывідуальна-аўтарскім стылі і ў мове мастацкай літаратуры, а на сучасным этапе назіраецца іх шырокае распаўсюджванне па-за рамкамі мовы мастацкай літаратуры – у публіцыстычным і нават у навуковым стылях.

На аснове функцыянальнага падыходу ў сучасным мовазнаўстве складваецца напрамак стылістычнага сінтаксісу, прадметам вывучэння якога выступаюць стылістычныя функцыі эліптычных сказаў, што разглядаюцца як экспрэсіўныя сродкі мовы, і асаблівасці ўжывання эліптычных канструкцый ў розных функцыянальных стылях. Вучоныя стылістычнага кірунку распрацавалі сваю тэарэтычную базу і метадалагічны апарат, якія грунтаваліся на прынцыпах стылістыкі сінтаксісу.

У працах А. Г. Копнінай на шырокім фактычным матэрыяле парцэляваныя канструкцыі як адзінкі стылістычнага сінтаксісу разглядаюцца з улікам структурнай арганізацыі і асаблівасцей семантыкі парцэляваных сказаў. Пры гэтым акцэнтуецца ўвага на стылістычнай функцыі, асаблівасцях выкарыстання парцэляваных канструкцый у розных функцыянальных стылях, і на аснове гэтага робяцца высновы, што такія канструкцыі часцей сустракаюцца ў гутарковым, мастацкім і публіцыстычным стылях [16, с. 135].

В. М. Стральцоў лічыць, што парцэляцыя – структура стылістычнага характару, якая цесна звязана з граматычным паняццем эканоміі ў мове і маўленні [17, с. 5].

Недастаткова ў літаратуры вырашаецца пытанне аб размежаванні парцэляцыі і эліпсіса. Вядома, што парцэляваныя канструкцыі знешне падобныя да эліптычных, але адрозніваюцца ад апошніх тым, што ні адзін з парцэляваных кампанентаў не выражаецца імпліцытна. Пры ўсёй неадназначнасці трактовак парцэляцыі, даследчыкі адзіны ў думцы, што дадзеныя канструкцыі з'яўляюцца стылістычна адметнай з'явай, якая не выходзіць за межы моўных норм, і выкарыстоўваецца пісьменнікамі самых розных напрамкаў.

Для кваліфікацыі і поўнага асэнсавання з'явы парцэляцыі неабходна выйсці за рамкі апісання сінтаксічнай структуры і ўлічваць пэўныя экстралінгвістычныя ўмовы, прагматычныя фактары і прынцыпы антрапацэнтрычнасці і эгацэнтрычнасці ў камунікатыўнай сферы, арыентаванай на падзел інфармацыі і яе актуалізацыю.

*Літаратура*

1. *Валгина, Н. С.* Активные процессы в современном русском языке : учеб. пособие для студентов вузов / Н. С. Валгина. – М. : Логос, 2001. – 304 с.
2. *Акимова, Г. Н.* Новое в синтаксисе современного русского языка : учеб. пособие / Г. Н. Акимова. – М. : Высшая школа, 1990. – 168 с.

*References*

1. *Valgina, N. S.* Aktivnyye protsessy v sovremennom russkom yazyke : ucheb. posobiye dlya studentov vuzov / N. S. Valgina. – M. : Logos, 2001. – 304 s.
2. *Akimova, G. N.* Novoye v sintaksise sovremennogo russkogo yazyka : ucheb. posobiye / G. N. Akimova. – M. : Vysshaya shkola, 1990. – 168 s.

3. *Харитонова, Е. В.* Динамика структуры синтаксиса современного русского языка: тенденции к экономичности и дистинктности (на материале современной прессы) : дис. … канд. филол. наук : 10.02.01 / Е. В. Харитонова. – Волгоград, 2014. – 266 л.
4. *Щерба, Л. В.* Избранные работы по русскому языку / Л. В. Щерба. – М., 1928. –188с.
5. *Ефремов, А. Ф.* Язык Н. Г. Чернышевского / А. Ф. Ефремов. – М., 1952. – 380 с.
6. *Виноградов, А. А.* К вопросу о дифференциации явлений парцелляции и динамического присоединения / А. А. Виноградов // Вопросы языкознания. – 1981. – № 3. – С. 98–102.
7. *Виноградов, В. В.* Стиль Пушкина / В. В. Виноградов. – М. : Просвещение, 1941. – 620 с.
8. *Ванников, Ю. В.* Синтаксис речи и синтаксические особенности русской речи / Ю. В. Ванников. – М. : Русский язык, 1978. – 296 с.
9. *Иванчикова, Е. А.* Парцелляция, ее коммуникативно-экспрессивные и синтаксические функции / Е. А. Иванчикова // Морфология и синтаксис современного русского литературного языка. – М., 1968.
10. *Сковородников, А. П.* Экспрессивные синтаксические конструкции современного русского литературного языка: опыт системного исследования : дис. … д-ра филол. наук / А. П. Сковородников. – Красноярск, 1982. – 362 с.
11. *Конюхова, Л. І.* Явище парцеляції в мові сучасних засоб і в масової комунікації : автореф. … канд. філол. наук : спец. 10.02.01 «Українська мова» / Л. І. Конюхова. – Львів, 1999. – 17 с.
12. *Андриевская, А. А.* Явление «сепаратизации» в стилистическом синтаксисе французской художественной прозы / А. А. Андриевская // Научные доклады высшей школы. Филологические науки. – 1963. – № 3 – С. 61–67.
13. *Пинегина, Я. Н.* Парцеллированные и их коммуникативно-прагматические функции в современных медиатекстах : дис. … канд. филол. наук / Я. Н. Пинегина. – Ростов н/Д, 2005. – 23 с.
14. *Филонова, Н. К.* Коммуникативная организация парцеллированных высказываний / Н. К. Филонова // Структурные коммуникативные и функциональные особенности предложения и текста. – Свердловск, 1989. – С. 31–38.
15. *Покровская, Е. А.* Динамика русского синтаксиса в XX веке: лингвокультурологический анализ : дис. … д-ра филол. наук : 10.02.01 / Е. А. Покровская. – Ростов н/Д, 2000. – 182 л.
16. *Копнина, Г. А.* Парцелляция / Г. А. Копнин // Стилистический энциклопедический словарь русского языка / под ред. М. Н. Кожиной. – М. : Флинта: Наука, 2006. – 696 с. – С. 279–282.
17. *Стрельцов, В. Н.* Парцелляция в структуре сложноподчиненного предложения в современном английском языке : автореф. … канд. филол. наук : 10.02.04 / В. Н. Стрельцов. – М., 1974.

3. *Kharitonova, Ye. V.* Dinamika struktury sintaksisa sovremennogo russkogo yazyka: tendentsii k ekonomichnosti i distinktnosti (na materiale sovremennoy pressy) : dis. … kand. filol. nauk : 10.02.01 / Ye. B. Kharitonova. – Volgograd, 2014. – 266 l.
4. *Shcherba, L. V.* Izbrannyye raboty po russkomu yazyku / L. V. Shcherba. – M., 1928. – 188 s.
5. *Yefremov, A. F.* Yazyk N. G. Chernyshevskogo / A. F. Yefremov. – M., 1952. – 380 s.
6. *Vinogradov, A. A.* K voprosu o differentsiatsii yavleniy partsellyatsii i dinamicheskogo prisoyedineniya / A. A. Vinogradov // Voprosy yazykoznaniya. – 1981. – № 3. – S. 98–102.
7. *Vinogradov, V. V.* Stil Pushkina / V. V. Vinogradov. – M. : Prosveshcheniye, 1941. – 620 s.
8. *Vannikov, Yu. V.* Sintaksis rechi i sintaksicheskiye osobennosti russkoy rechi / Yu. V. Vannikov. – M. : Russkiy yazyk, 1978. – 296 s.
9. *Ivanchikova, Ye. A.* Partsellyatsiya, yeyo kommunikativno-ekspressivnyye i sintaksicheskiye funktsii / Ye. A. Ivanchikova // Morfologiya i sintaksis sovremennogo russkogo literaturnogo yazyka. – M., 1968.
10. *Skovorodnikov, A. P.* Ekspressivnyye sintaksicheskiye konstruktsii sovremennogo russkogo literaturnogo yazyka: opyt sistemnogo issledovaniya : dis. … d-ra filol. nauk / A. P. Skovorodnikov. – Krasnoyarsk, 1982. – 362 s.
11. *Konyukhova, L. I.* Yavishche partsellyatsiyi v movi suchasnykh zasob i v masovoy komunikatsiyi : avtoref. … kand. filol. nauk : spets. 10.02.01 “Ukrayinska mova” / L. I. Konyukhova. – Lviv, 1999. – 17 s.
12. *Andriyevskaya, A. A.* Yavleniye “separatizatsii” v stilisticheskom sintaksise frantsuzskoy khudozhestvennoy prozy / A. A. Andriyevskaya // Nauchnyye doklady vysshey shkoly. Filologicheskiye nauki. – 1963. – № 3 – S. 61–67.
13. *Pinegina, Ya. N.* Partsellirovannyye i ikh kommunikativno-pragmaticheskiye funktsii v sovremennykh mediatekstakh : dis. … kand. filol. nauk / Ya. N. Pinegina. – Rostov n/D, 2005. – 23 s.
14. *Filonova, N. K.* Kommunikativnaya organizatsiya partsellirovannykh vyskazyvaniy / N. K. Filonova // Strukturnyye kommunikativnyye i funktsionalnyye osobennosti predlozheniya i teksta. – Sverdlovsk, 1989. – S. 31–38.
15. *Pokrovskaya, Ye. A.* Dinamika russkogo sintaksisa v XX veke: lingvokulturologicheskiy analiz : dis. … d-ra filol. nauk : 10.02.01 / Ye. A. Pokrovskaya. – Rostov n/D, 2000. – 182 l.
16. *Kopnina, G. A.* Partsellyatsiya / G. A. Kopnin // Stilisticheskiy entsiklopedicheskiy slovar russkogo yazyka pod red. M. N. Kozhinoy. – M. : Flinta : Nauka, 2006. – 696 s. – S. 279–282.
17. *Streltsov, V. N.* Partsellyatsiya v structure slozhnopodchinyonnogo predlozheniya v sovremennom angliyskom yazyke : avtoref. … kand. filol. nauk : 10.02.04 / V. N. Streltsov. – M., 1974.